**І. М. Грамовіч,** *дацэнт кафедры беларускай народна-песеннай творчасці, кандыдат педагагічных навук*

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ «ПАСТАНОЎКА ГОЛАСУ» ЯК СУЧАСНЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ СРОДАК У АВАЛОДАННІ НАРОДНАЙ МАНЕРАЙ СПЕВАЎ СТУДЭНТАМІ ЗАВОЧНАЙ ФОРМЫ АТРЫМАННЯ АДУКАЦЫІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Навучальны працэс на сучасным этапе патрабуе адпаведнага навукова-метадычнага забеспячэння. Менавіта на факультэце завочнага навучання вучэбна-метадычны комплекс (ВМК) з’яўляецца важным эфектыўным інфармацыйным сродкам для арганізацыі адукацыйнага працэсу, забяспечвае арганізацыю самастойнай работы студэнтаў і дапамагае набыць рэкамендацыі па авалоданні ведамі ў галіне розных дысцыплін у межах новага адукацыйнага стандарту.

Мы згодны з трактоўкай Д. Д. Зуева аб тым, што «вучэбны комплекс прадстаўляе сабой сістэму дыдактычных сродкаў навучання па канкрэтным прадмеце (пры вядучай ролі падручніка), ствараемую ў мэтах найбольш поўнай рэалізацыі выхаваўчых і адукацыйных задач, сфармуляваных праграмай па гэтым прадмеце, і служыць усебаковаму развіццю асобы навучэнца» [ 3, с. 215].

Вучэбна-метадычны комплекс мае шмат варыянтаў і з’яўляецца мадэльным апісаннем педагагічнай сістэмы, якая аб’ядноўвае ў адзінае цэлае розныя дыдактычныя сродкі навучання, фіксуе і раскрывае патрабаванні да зместу вывучаемай дысцыпліны, уменняў, навыкаў і кампетэнцый падрыхтоўкі спецыялістаў, змяшчае сродкі дыягностыкі іх рэалізацыі, выступае ў якасці інструмента вучэбна-метадычнага забеспячэння самастойнай работы студэнтаў па пэўнай вучэбнай дысцыпліне, служыць назапашванню ведаў, наватарскіх ідэй і распрацовак, а таксама стымулюе развіццё творчага патэнцыялу студэнта і выкладчыка.

Методыка пабудовы ВМК прадстаўляе сабой тэхналогію модульнага навучання, якая ўключае агульную структуру ВМК у выглядзе сціплай версіі вучэбнага курса. Праблему распрацоўкі ВМК для агульнаадукацыйных прадметаў мы разглядаем на тэарэтыка-метадычным, тэхналагічным і практычным узроўнях, тады як ВМК па дысцыплінах музычных спецыяльнасцей павінен

улічваць спецыфіку іх выкладання, будавацца па сваёй форме, мець сваю структуру і метадычнае напаўненне.

Галоўнай задачай ВМК з’яўляецца кіраванне самастойнай работай студэнта, тым больш што самастойная работа пераважае у структуры вучэбна-адукацыйнай дзейнасці студэнтаў завочнай формы навучання. Для самастойнай работы студэнта-завочніка музычных спецыяльнасцей прапаноўваюцца такія формы, як работа з першакрыніцай і падручнікам, распрацоўка мадэлей заняткаў, аналіз дадатковай літаратуры, праца з нотным матэрыялам для ўдзелу ў практычных занятках, праслухоўванне музычных аўдыя- і відэазапісаў і інш.

На кожным этапе навучання актыўнасць пазнавальнай дзейнасці ў большасці залежыць ад выкладчыка: узроўню педагагічнага мыслення і яго крытычнасці, магчымасцей і імкнення да праблемнага навучання, абгрунтавання сваіх поглядаў. Змястоўным бокам актывізацыі навучальнага працэсу з’яўляецца падбор матэрыялу для складання заняткаў, канструяванне педагагічных задач на аснове праблемнага навучання з улікам індывідуальных здольнасцей студэнтаў.

Актывізацыя вучэбнага працэсу пачынаецца з дыягностыкі і мэтапакладання ў педагагічнай дзейнасці. Пры гэтым выкладчык павінен дбаць перш-наперш аб мацаванні станоўчых адносін студэнта да прадмета. Далей ствараюцца ўмовы для сістэматычнай пошукавай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці ў авалодванні народнай манерай спеваў, што забяспечвае адэкватную самаацэнку студэнтаў у працэсе навучання на аснове самакантролю і самакарэкцыі. І нарэшце, выкладчык імкнецца стварыць умовы для самастойнай творчай дзейнасці з улікам сфарміраванасці інтарэсу.

Распрацоўка ВМК на кафедры народна-песеннай творчасці мае свае складанасці. Калі ў такіх лекцыйных курсах, як «Хоразнаўства», «Гісторыя вакальнага мастацтва», «Методыка работы з хорам», «Методыка выкладання спецдысцыплін», магчыма выкарыстоўваць блочна-модульную тэхналогію навучання, то спецыфіка выкладання дысцыплін «Харавы клас», «Дырыжыраванне», «Пастаноўка голасу», «Вакальны ансамбль» патрабуе спецыяльнай структурнай пабудовы. Індывідуальныя і практычныя заняткі па названых дысцыплінах вельмі складана перавесці ў блочна-модульную ці модульную тэхналогію.

У адрозненні ад лекцыйных курсаў, дзе студэнт можа самастойна прачытаць той ці іншы вучэбны матэрыял і набыць веды па прадмеце, пры авалодванні народнай манерай спеваў выпрацаваць

навыкі і ўменні правільнага гукаўтварэння немагчыма без пастаяннага кантролю выкладчыка. Завочная форма навучання прымушае студэнта працаваць і кантраляваць свае поспехі ў навучанні па дадзеным прадмеце самастойна.

Кіруемая самастойная работа студэнта-завочніка гэта арганізацыйная дзейнасць, якая ўключае такія кампаненты, як:

– абгрунтаванне мэт і задач навучання;

– распрацаваныя вучэбныя заданні;

– дакладнае і сістэмнае планаванне самастойнай работы;

– пошук інфармацыйнай, вучэбнай і навуковай літаратуры;

– засваенне інфармацыі і яе лагічная перапрацоўка;

– выкарыстанне метадаў навукова-даследчай работы для вырашэння пастаўленых задач;

– выпрацоўка асабістай пазіцыі наконт дасягнення мэт у авалоданні прадметам;

– самакантроль і самааналіз.

Асноўныя кірункі работы, якімі неабходна карыстацца пры правядзенні практычных самастойных заняткаў па дысцыпліне «Пастаноўка голасу»: спевы вакальных практыкаванняў, творчая работа над народнай ці аўтарскай песняй, пошук неабходнай інфармацыі для выпраўлення памылак гучання голасу, самастойнае папаўненне ведаў аб музычным песенным матэрыяле, граматная арыентацыя ў канструяванні педагагічнай сітуацыі.

Магчымай тыпавой структурай ВМК па дысцыпліне «Пастаноўка голасу» можа быць наступная:

1. Вучэбная праграма.
2. Вучэбныя модулі дысцыпліны «Пастаноўка голасу».
3. Метадычныя ўказанні па вывучэнні дысцыпліны.
4. Практыкум з практыкаваннямі.
5. Заданні для кіруемай самастойнай работы.
6. Інфармацыйна-даведкавы матэрыял.
7. Прыкладны рэпертуарны спіс твораў для народнага голасу.
8. Хрэстаматыі, падручнікі.
9. Крытэрыі ацэнкі ведаў.
10. Спіс літаратуры.
11. Аўдыя- і відэазапісы майстар-класаў і вядучых выканаўцаў народнай песні.

Як правіла, ВМК складаецца з некалькіх вучэбных модулей і адпавядае раздзелам вучэбнай праграмы вывучаемай дысцыпліны. Мы пастараліся захаваць асноўныя структурныя элементы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

модульнай сістэмы і прапаноўваем найбольш прымальныя для дысцыпліны «Пастаноўка голасу».

1. УВОДЗІНЫ Ў МОДУЛЬ

Уводзіны ў модуль змяшчаюць:

– задачы і мэты дысцыпліны, якія дазваляюць зрабіць рэальным для студэнта станоўчы вынік вывучэння дысцыпліны;

– асноўныя этапы і напрамкі адукацыйнай дзейнасці;

– метадычныя рэкамендацыі і прктыкумы;

– указанні на метадычныя распрацоўкі.

2. ПРАГРАМА МОДУЛЯ

Праграма модуля знаёміць з вучэбнай праграмай дысцыпліны.

3. АСНОЎНЫ ТЭКСТ І ЯГО МЕТАДЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

Асноўны тэкст і яго дыдактычныя матэрыялы прапаноўваюць даступную і зразумелую інфармацыю, якая можа быць засвоена без дапамогі выкладчыка. Тэкст суправаджаецца дадатковымі дыдактычнымі элементамі, якія садзейнічаюць паспяховаму разуменню вывучаемай дысцыпліны. У якасці такіх элементаў выступаюць:

– правільныя і дакладныя фармулёўкі;

– вучэбныя заданні і практыкаванні;

– змястоўныя элементы: кірункі працы, выяўленне памылак і іх выпраўленне, спасылкі на літаратуру;

– заданні для самастойнай работы і самакантролю.

4. КАНТРАЛЮЮЧЫ БЛОК

Кантралючы блок уключае сродкі навучання, якія павінны выконваць кантралюючую функцыю і забяспечыць цэласны кантроль за самастойнай работай студэнта. Кантралюючы блок прадугледжвае дзве мэты. Гэта вызначэнне якасці атрыманых ведаў і развіццё самастойнага творчага і даследчага мыслення.

Дасягненне гэтых мэт спрыяе фарміраванню ўласнай пазіцыі адносна прапанаваных метадычных прыёмаў і рэкамендацый. Самакантроль студэнта за якасцю гучання свайго голасу стварае ўмовы для рэалізацыі свайго творчага патэнцыялу. Задача педагога пры ацэньванні выкананай работы – звярнуць увагу на якасныя паказчыкі фарміравання гучання голасу.

5.ДАДАТКОВЫЯ СРОДКІ

Вельмі прадуктыўнымі з’яўляюцца падтрымка і суправаджэнне сродкамі відэа- і аўдыязапісаў майстар-класаў вядучых выкладчыкаў пастаноўкі народнага голасу, вядомых выканаўцаў народнай песні, а таксама знаёмства з навучальнымі праграмамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

1. *Дмитриев, Е. И.* Инновационный образовательный комплекс вуза : конспект лекций-презентаций : учеб.-метод. пособие / Е. И. Дмитриев. – Минск : РИВШ, 2009. – 194 с.

2. *Жук, А. И.* Учебно-методические комплексы (из опыта разработки) : метод. пособие / А. И. Жук, А. В. Макаров. – Минск : БГУ. – 2001. – 47 с.

3. *Зуев, Д. Д.* Школьный учебник / Д. Д. Зуев. – М. : Педагогика, 1983. – 238 с.

4. *Иванов, А.* Современные учебно-методические комплексы нового поколения: состояние, проблемы, пути решения, перспективы / А. Иванов // Школа. – 1997. – № 2. – С. 54–58.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ